# ЖАЛОБА ІВАНАВА ДНЯ


ВЕКАПОМНАЕ

***Толькі сумеснымі намаганнямі зможам аднавіць "белыя плямы" ў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.***

Днямі ў трубцы тэлефона пачула ўсхваляваны голас старога чалавека:

— *Чаму ніхто не прыгадвае, што 70 год таму былі спалены Дзятлаўскія хутары?..*

Завочны суразмоўца сцвярджаў, што людзей і дамы знішчылі 9 кастрычніка, хаця ў дакументах указана іншая дата. Дамовіліся аб сустрэчы са старажылам.

Разам са старшынёй Дзятлавіцкага сельвыканкама Канстанцінам Мардухаем завітваем на дагледжаны двор, дзе вока вабяць вялікія кусты хрызантэм. У дыхтоўным доме сустракаюць гасцінныя гаспадары. 92-гадовы Максім Кацуба пачынае расповяд, а яго 85-гадовая жонка Ганна Антонаўна раз-пораз яскравымі дэталямі дапаўняе расказ мужа.

Хутар Лясныя цяпер мае назву вуліца Лясная. Калі ісці праз лес, на адлегласці ў 7 кіламетраў знаходзіцца Мелясніца. Максім Іванавіч падкрэслівае аналогіі бяды. І там, і тут не было фармальнай падставы для трагедыі. Як і жыхары вёскі, што знішчана 1 кастрычні- *родных, але і сама стала ахвярай фашызму...*

У яго сям'і загінулі шасцёра: бацька Іван Максімавіч (яго партрэт вісіць у доме сына побач з іконамі), мама Матрона Арцёмаўна, 19-гадовы брат Аляксандр, тры сястры — Марыя, Вольга, Тамара, якім было адпаведна 16, 13 і 12 год.

Максім Іванавіч расказвае, што яго вывезлі на прымусовую працу ў Германію з першым наборам — 27 мая 1942 года. Старэйшая сястра Зінаіда яшчэ да вайны выйшла замуж у Дзятлавічы за Нічыпара Лявонавіча Канапацкага. Калі даведалася аб знішчэнні роднага хутара, пабегла на папялішча і ад убачанага, цяжарная, ледзь не страціла прытомнасць.

— *Прыграбла зямлёю костачкі родных, а 1 лістапада нарадзіла дзяўчынку. У памяць маці назвала дачку Матронай... Праз два месяцы немцы дазволілі пахаваць няшчасных на вясковых могілках. Сабрала астанкі ў адну труну... Сястра і паштоўку мне ў Нямеччыну даслала. Напісала толькі, што няма ўжо нашых родных. Да таго часу баўэры дазвалялі* Германію. У лютым 1947-га вярнуўся на радзіму. На бацькоўскім участку адбудаваў дом, ажаніўся з дзяўчынай з суседняга хутара Посныя (цяпер — вуліца Брэсцкая). Працаваў у леспрамгасе, на пенсію выйшаў з АП-10. Разам з жонкай выгадавалі добрых дзяцей — чатырох дачок і сына. Унукаў таксама пяцёра. Ёсць і праўнук Захар — пяцікласнік.

— *Запомніў словы сястры, што трагедыя здарылася ў Іванаў дзень — 9 кастрычніка,* — падкрэслівае Максім Іванавіч. — *Таму пляменніца, якая пра- даркамі".* Згодна са "Зводам помнікаў гісторыі і культуры" (1990), у гэтай трагедыі ахвярамі сталі 93 жыхары. У кнізе "Памяць. Лунінецкі раён" (1995) увекавечаны 178 імёнаў дзяцей і дарослых, але там адсутнічаюць дадзеныя аб сям'і Івана і Матроны Кацубы.

Звярнулася да спецыялізаваных энцыклапедычных выданняў. У "Зводзе..." па Дзятлавічах указаны тры магілы ахвяр фашызму, на якіх устаноўлены абеліск і стэлы. Але магіла — адна. Тут пахаваны 19 жыхароў, расстраляных фашыстамі як

што знішчана 1 кастрычніка, у ноч на 9 кастрычніка сем'і з хутара не пайшлі начаваць у лес (звычайная мера бяспекі ў 1943-ім). Напярэдадні ішоў дождж, і людзі засталіся ва ўтульных цёплых хатах. Гэтым і скарысталіся карнікі. Яны вечарам накіравалі з Лунінца абоз.

— *Гаспадарам вазоў загадалі затаіцца ў навакольным лесе,* — гаворыць Максім Іванавіч. — *Ведаю дакладна, таму што адным з возчыкаў быў муж маёй цёткі. Але і ён не мог папярэдзіць родных, таму што сам хутар быў ацэплены немцамі.*

На досвітку фашысты ўваходзілі ў дамы, расстрэльвалі людзей, а трупы закідвалі саломай. Калі з хат і хлявоў забралі маёмасць і жывёлу, пабудовы падпалілі. Кулі і агонь у момант спынілі жыццё мірнага паселішча...

Старыя сцвярджаюць, што лёс збярог толькі аднаго хлопчыка. Дакладна не памятаюць яго імя, ведаюць толькі прозвішча — Сяргейчык і мясцовую мянушку — Крышанчык. 4-5-гадовае дзіця схавалася ў падпечку. Затаілася там, не рэагуючы ні на стрэлы ў родных, ні на аўтаматную чаргу, што прайшла побач з ножкамі. Калі ж пацягнула дымам, выпаўз са свайго сховішча і пад гэтай завесай дабег да выратавальнага лесу...

— *Дарэчы, яго маці памерла, а другая жонка бацькі была родам з Мелясніцы,* — адзначае Максім Іванавіч. — *Смуткавала па часу баўэры дазвалялі водпускі некаторым усходнім работнікам. Вяртаючыся са сваіх мясцін, на якіх панавалі акупанты, мае таварышы па няволі гаварылі, што немцы забіваюць людзей і паляць вёскі. Так здагадаўся, што родныя загінулі. Сам не ведаю, як здолеў перажыць гэту чорную вестку...*

Вытрымка і цяпер не пакідае невысокага хударлявага старога. Толькі вочы, што блішчаць за тоўстым шклом акуляраў, выдаюць нявыплаканы боль сына і брата...

Праз тры гады няволі остарбайтэр быў вызвалены Чырвонай Арміяй. 2 мая 1945-га залічаны ў запасны полк. Служыў у Польшчы (з Памераніі ішлі пехатою ў Данцыг-Гданьск), а затым зноў перавялі ў



*Таму пляменніца, якая прадае свечкі ў царкве, перадала маю просьбу свяшчэнніку адслужыць паніхіду ў гэты дзень. І яшчэ адно пытанне шмат год не дае мне спакою. Чаму наш знішчаны хутар не ўвекавечаны ў мемарыяльным комплексе Хатынь?*

Розныя крыніцы даюць розныя звесткі аб ахвярах трагедыі. У Акце расследавання злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў на часова акупіраванай тэрыторыі раёна ад 10.04.1945 г. указана, што *"17 кастрычніка 1943 года на хутарах вёскі Дзятлавічы фашыстамі было спалена 148 чалавек, у тым ліку 51 жанчына і 57 дзяцей, і расстраляна 68 чалавек, у тым ліку 20 жанчын і 14 дзяцей, якіх нямецкія каты спалілі разам з іх гаспа-*

расстраляных фашыстамі як заложнікі ў чэрвені 1942 года. Помнік, адлюстраваны на здымку, устаноўлены ў памяць аб знішчаным у кастрычніку 1943-га хутары Лясныя. Агароджа пастаўлена на месцы спаленых немцамі дамоў партызан Велесюкоў (адзін з іх, Кірэй, загінуў у баі, другі — Ульян, жыў і пасля вайны. Яны абодва паспелі забраць свае сем'і ў лес). Побач узвышаюцца маўклівыя сведкі трагедыі — вялікія грушы... Ахвяры фашызму пахаваны на вясковых могілках, а на помніку мемарыяльная пліта не ўвекавечыла 109 імёнаў.

— *Менавіта столькі — у спісе, што дастаўся мне ад папярэднікаў і захоўваецца ўсельвыканкаме,* — гаворыць старшыня К.А. Мардухай. — *Цяпер накіравалі запыты ў шэраг архіваў. Збяром усе магчымыя дакументы, каб нарэшце паставіць кропку над "і". Абавязкова правядзем памятнае мерапрыемства з удзелам родных ахвяр фашызму і прадстаўнікоў грамадскасці. "Гэта трэба не мёртвым — гэта трэба жывым". Ушанаваўшы памяць загінуўшых мірных жыхароў, на наступны год будзем мець маральнае права адзначаць 70-годдзе вызвалення Беларусі. Наша моладзь павінна ведаць, ад паўтарэння якіх трагедый выратавала нас Перамога ў Вялікай Айчыннай вайне.*

**Таццяна КАНАПАЦКАЯ.**
**Фота аўтара.**